МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
Кафедра сацыяльнай камунікацыі

КАЛЕСНІКАВА Вольга Уладзіміраўна

# СТРАТЭГІІ ПРАСУВАННЯ ІНДЗІ-МУЗЫКАНТАЎ У БЕЛАРУСІ

Дыпломная работа
АНАТАЦЫЯ
Спецыяльнасць 1-23 01 15 Сацыяльныя камунікацыі

Навуковы кіраўнік:
старшы выкладчык
М.С.Цярэшчанка

Мінск, 2025

# АНАТАЦЫЯ

Дыпломная праца на тэму «Стратэгіі прасоўвання індзі-музыкантаў у Беларусі» мае наступную структуру: уводзіны, два раздзелы і заключэнне.

Першы раздзел і першы параграф другога раздзела з'яўляюцца тэарэтычнымі. У іх раскрываюцца паняцці індзі-музыкі, DIY-культуры, даследуюцца станаўленне і развіццё індзі-сцэны ў свеце і спецыфічныя рысы беларускай незалежнай музыкі, разглядаюцца актуальныя тэндэнцыі развіцця незалежнай музычнай індустрыі ў Беларусі, а таксама аналізуюцца агульныя магчымасці і інструменты прасоўвання для музыкантаў. Другі параграф другога раздзела з'яўляецца практычным і прысвечаны дэталёваму аналізу канкрэтных стратэгій прасоўвання, якія выкарыстоўваюцца беларускімі індзі-музыкантамі, на аснове метаду кейс-стадзі.

Аб'ём дыпломнай працы складае 53 старонкі і ўключае 7 дадаткаў і 29 выкарыстаных крыніц.

Ключавыя словы: індзі-музыка, індзі-музыканты, стратэгіі прасоўвання, DIY-культура, беларусь, сацыяльныя сеткі, лічбавае прасоўванне, кейс-стадзі, анлайн-прасоўванне, афлайн-прасоўванне.

Мэтай дыпломнай працы з'яўляецца аналіз стратэгій прасоўвання індзі-музыкантаў у беларускай музычнай індустрыі.

Аб'ект працы – індзі-музыканты беларускай музычнай індустрыі.

Прадмет – стратэгіі прасоўвання індзі-музыкантаў у беларускай музычнай індустрыі.

Метадалагічную аснову дыпломнай працы склалі агульнанавуковыя метады (аналіз і сінтэз, параўнанне, індукцыя і дэдукцыя), а таксама стратэгія даследавання кейс-стадзі, якая ўключае аналіз анлайн-актыўнасці музыкантаў, аналіз іх сацыяльных сетак, і правядзенне і аналіз глыбінных інтэрв'ю з індзі-музыкантамі.

У працэсе напісання дыпломнай працы былі атрыманы наступныя вынікі: раскрыта паняцце індзі-музыкі і яго эвалюцыя, даследаваны станаўленне і развіццё індзі-сцэны ў свеце і спецыфічныя рысы беларускай індзі-музыкі; выяўлены ключавыя тэндэнцыі і праблемы развіцця сучаснай індзі-музычнай індустрыі ў Беларусі.

У межах працы быў праведзены аналіз пяці кейсаў беларускіх індзі-музыкантаў для выяўлення і апісання тыпаў стратэгій прасоўвання, якія яны прымяняюць.